UNUS PRO OMNIBUS

# ВАЛОВІЧЫ

## Ў ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА XV–XVIII стст.



Сяргей Амелька

# Радавод лініі Крыштафа Казіміра Валовіча XVII–XVIII стст. (паводле дакументаў НГАБГ)*

У дадатак да вывадовых матэрыялаў Валовічаў за 1875 г. з ГДДС намі была здзейснена археаграфічная разведка па выяўленні іншых дакументаў па гісторыі роду за XVI–XVIII стст., якія захоўваюцца сёння ў гарадзенскім НГАБ. Улічваючы тое, што асобнага фонду Валовічаў у архіве няма, намі былі прагледжаны вопісы і рукапісныя матэрыялы пераважна з фондаў родаў Слізняў і Быхаўцаў.

Фарміраванне фонду Слізняў (Ф. 1663, воп. 1) адбывалася ў перыяд з XVI па першую палову XX ст. Храналагічныя рамкі дакументаў фонду – 1559–1938 гг. У 1955 г. яны ў выглядзе россыпу вагой 300 кг былі перададзены на захоўванне ў Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў (ЦДГА) БССР у Горадні са Слонімскага краязнаўчага музея (цяпер –СКМ

* *Праца напісана ў рамках навукова-даследчай праекта «Сямейная гісторыя і генеалогія Беларусі: феномен сваяцтва ў еўрапейскай гісторыка-культурнай традыцыі», якая выконваецца па праграме «Гуманітарныя навукі як фактар развіцця беларускага грамадства і дзяржаўнай ідэалогіі» на 2011–2015 гг. у падпраграме № 1 «Гісторыя, духоўная і матэрыяльная культура беларускага народа» Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў Рэспублікі Беларусь «Гісторыя, культура, грамадства, дзяржава».*

імя Іосіфа Стаброускага)[1]. Толькі у 1959 г. была праведзена навукова-тэхшчная апрацоўка дакументаў. У вопісы была ўнесена 4951 справа. Па сваім змесце яны складаюцца з швентарных апісанняў маёнткаў, фальваркаў, спраў па спрэчках на правы спадчыны, дарчых запісаў на маёмасць, лістоў аб раздзеле, перадачы, арэндзе, заставе і продажы маёнткаў, дыярыушаў, прыватнай перапіскі і інш. З іх нам удалося выявіць 25 спраў, якія датычаць роду Валовічаў. Трапілі яны сюды пераважна ў выніку судовых працэсаў са Слізнямі і шшымі шляхецкімі родамі са Слонімскага павета ВКЛ, праз сямейна-шлюбныя адносіны, куплі, продажы, падараванні.

У фондзе Быхаўцаў (Ф. 1664, воп. 1) налічваецца 893 справы за 1511–1938 гг. Яны паступілі на захоўванне ў ЦДГА БССР у Горадш у 1955 г. з Ваўкавыскага ваенна-гістарычнага музея на падставе рашэння Міністэрства культуры БССР за № 10/3-857 ад 1 верасня 1955 г. Колькасць выяўленых дакументаў, якія адносяцца да Валовічаў, значна меншая — 6. Яны былі звязаны з Быхаўцамі праз набыццё апошнімі маёнтка Хмельніца у Слонімскім павеце у XVIII ст.

Два дакументы адшукаліся ў фондзе Гарадзенскага дамініканскага мужчынскага кляштара (Ф. 1759, воп. 1). Яны звязаны з прадстаўшкамі гарадзенскай лішн Валовічаў — Тамашам Сташславам і Аляксандрам Уладзіславам Валовічамі, якія па чарзе займалі павятовы ўрад земскага падсудка (1667 і 1687 г.)[2].

Такім чынам, агульная колькасць выяўленых у НГАБГ дакументаў, якія ў той ці іншай ступені датычаць гісторыі і генеалогіі роду Валовічаў XVI–XVIII стст. — 33 адзшкі. У выніку іх апрацоўкі намі быў складзены рэестр. Храналагічна ён ахоплівае рукапісныя матэрыялы з 1561 па 1791 г. Усе дакументы XVI ст. прадстаўлены копіямі, зробленымі ў XVIII ст. Рэестр дакументаў складзены па персаналіях Валовічаў у храналагічным парадку, з паданнем выпраўленых і ўдакладненых намі загалоўкаў, з пазначэннем датаў, мовы, аб'ёму, наяўнасці пячатак і шыфраў захавання.

[1] У СКМ імя І. Стаброўскага засталася толькі невялікая колькасць дакументаў з родавага архіву Слізняў. Сярод іх адзін дакумент мае дачыненне да роду Валовічаў. Гэта — выпіс з кніг Слонімскага гродскага суда з квітам павятовага генерала аб увядзенні ў валоданне маёнткам Хмельніца Слонімскага павета Геранім Валовіча, старосціча калачэўскага (Слонім, 10 красавіка 1759 г.). Гл.: Шаланда А. Дакументальныя матэрыялы XVII–XVIII стст. у фондах Слонімскага краязнаўчага музея імя І. І. Стаброўскага // Герольд Litherland. 2002. № 3–4 (7–8). С. 64.

[2] UWKL WT. S. 303.

№ 1.

***Валовіч Грыгорый Грынькавіч,*** гаспадарскі маршалак, староста слонімскі, 1561 г.

Копіі дакументаў XVI ст. баяраў-шляхты Плаўскіх на землі ў Слонімскім павеце ВКЛ, якія адводзіў ім у валоданне слонімскі староста Грыгорый Грынькавіч Валовіч.

*Дата:* XVIII ст.

*Мова:* старабеларуская, лацінка.

*Аб'ём:* 3 арк.

*Шыфр:* Ф. 1663, воп. 1, спр. 4868.

№ 2.

***Валовіч Міхаіл Грыгоравіч,*** староста слонімскі, 1576 г.

Выпіс з земскіх кніг Слонімскага павета ад 31 кастрычніка 1776 г. з актыкаваным ў слонімскім гродскім судзе 5 сакавіка 1772 г. лістом польскага караля і вялікага князя літоўскага Стэфана Баторыя слонімскаму старосце Міхаілу Грыгоравічу Валовічу ад 24 лістапада 1576 г. аб наданні Івану Адынцу сяла Касцяневічы ў Слонімскім старостве, прылягаючага да яго бацькоўскага Сакалоўскага маёнтка.

*Дата:* 31 кастрычніка 1776 г.

*Пячатка:* дакумент замацаваны пячаткай земскага суда Слонімскага павета, 50×55 мм.

*Мова:* польская.

*Аб'ём:* 2 арк.

*Шыфр:* Ф. 1663, воп. 1, спр. 3961.

№ 3.

***Валовіч Міхаіл Грыгоравіч,*** староста слонімскі, 1577 г.

Выпіс са смаленскіх земскіх падкаморскіх кніг з копіяй прадажнага ліста ад 17 сакавіка 1577 г. Абрама Данілавіча Мяленікі, войскага слонімскага, для Міхаіла Грыгоравіча Валовіча, слонімскага старосты, на Катрыноўскае поле і грунт Скарамоплінскі, вылучаныя з маёнтка Дзевяткавічы.

*Дата:* 30 ліпеня 1738 г.

*Мова:* польская, старабеларуская, лацінка.

*Пячатка:* дакумент замацаваны падкаморскай смаленскай пячаткаі з гербам «Газдава» Антонія Марціна Храпавіцкага, падкаморыя смаленскага.

старосты пільвіскага, 35×45 мм.

*Аб'ём:* 2 арк.

*Шыфр:* Ф. 1663, воп. 1, спр. 1022.

№ 4.

***Валовіч Станіслаў Міхайлавіч,*** старосціч слошімскі, 1595 г.

Копіі дакументаў за 1595 г. па судовай справе Сташслава Мікалаевіча Нарбута, яго жонкі Гальшкі Янаўны Глябовіч і сына апошняй ад першага шлюбу Сташслава Міхайлавіча Валовіча з Янам Жарноўскім аб выдачы беглых з яго сяла Сакалова сялян.

*Дата:* XVIII ст.

*Мова:* старабеларуская, лацінка.

*Аб'ём:* 8 арк.

*Шыфр:* Ф. 1663, воп. 1, спр. 732.

№ 5.

***Валовіч Гальшка Міхайлаўна,*** жонка мсціслаўскага ваяводы, князя Аляксандра Яраслававіча Галаўчынскага, 1617 г.

Арэндны ліст мсціслаўскага ваяводы князя Аляксандра Яраслававіча Галаўчынскага і яго жонкі Гальшкі Міхайлаўны Валовіч для Януша Быхаўца на маёнтак Шацк у Менскім ваяводстве.

*Дата:* 28 красавіка 1617 г.

*Мова:* польская.

*Пячатка:* дакумент замацаваны 4 пячаткамі выстаўцаў і сведкаў, у тым ліку Гальшкі Міхайлаўны Валовіч, 14×16 мм.[3]

*Аб'ём:* 2 арк.

*Шыфр:* Ф. 1664, воп. 1, спр. 755.

№ 6.

***Валовіч Гальшка Міхайлаўна,*** удава мсціслаўскага ваяводы князя Аляксандра Яраслававіча Галаўчынскага, 1621 г.

Касацыйны пагаджальны ліст Гальшкі Валавічоўны Аляксандравай Галаўчынскай з князем Янам Галаўчынскім аб спыненш справы у Галоўным Трыбунале ВКЛ па спрэчных маёнтках Літва, Шацк, Балочы, Зацэш і вёскі

[3] Пра пячаткі Валовічаў гл. працу А. Шаланды у кнізе.

Хідры ў Менскім ваяводстве.

*Дата:* 20 студзеня 1621 г.

*Мова:* польская.

*Аб'ём:* 1 арк.

*Шыфр:* Ф. 1663, воп. 1, спр. 585.

№ 7.

***Валовіч Аляксандр Казімір,*** слонімскі земскі пісар, 1648 г.

Выпіс з гродскіх кніг Слонімскага замка з копіяй інструкцыі сой[illegible] слонімскай шляхты для паслоў, у тым ліку земскага пісара Аляксан[illegible] Казіміра Валовіча, на Варшаўскі элекцыйны сойм 1648 г.

*Дата:* 28 жніўня 1648 г.

*Мова:* старабеларуская, польская.

*Пячатка:* дакумент замацаваны пячаткай з асабістым складаным ге[illegible] слонімскага падстаросты Аляксандра Цехановіча, 14×16 мм.

*Аб'ём:* 2 арк.

*Шыфр:* Ф. 1663, воп. 1, спр. 410, арк. 30–31.

№ 8.

***Валовіч Ганна Самуэлеўна?,*** удава ваўкавыскага маршалка Сам[illegible] Пукніты Кляўзгеловіча, жонка слонімскага маршалка Пятра Тышке[illegible] 1654 г.[4]

Выпіс з земскіх кніг Ваўкавыскага павета з копіяй ліста ад 9 ліста[illegible] 1651 г. Ганны Валовіч Пукніцінай, яе дачкі Ізабэлы Пукшты і зяця Крыш[illegible] Каменскага, мечніка Навагрудскага ваяводства, які прызнаў Стан[illegible] Сегеню заставу маёнтка Манцякі Цывінішчызны і Грыбаўшчызны.

*Дата:* 7 чэрвеня 1670 г.

*Мова:* старабеларуская, польская.

*Пячатка:* дакумент замацаваны пячаткай з гербам «Газдава [illegible]выскага земскага суддзі Станіслава Уладзіслава Трызны, 29×31 мм.

*Аб'ём:* 3 арк.

*Шыфр:* Ф. 1664, воп. 1, спр. 667, арк. 3–5.

[4] Ганна Валовіч, верагодна, была дачкой Самуэля Міхайлавіча Валовіч[illegible]

№ 9.

***Валовіч Крыштаф Казімір,*** 1655 г.

Інструкцыя шляхты Слонімскага павета для паслоў Аляксандра Слізня, стольніка ашмянскага, і Марцыяна Цехановіча, слонімскага гродскага суддзі, смаленскага падчашага ў абоз шляхты Лідскага, Гарадзенскага і Ваукавыскага паветаў.

*Дата:* 18 лістапада 1655 г.

*Мова:* польская.

*Аб'ём:* 1 арк.

*Шыфр:* Ф. 1663, воп. 1, спр. 410, арк. 164–164 адв.

№ 10.

***Валовіч Тамаш Станіслаў,*** гарадзенскі земскі падсудак, 1667 г.[5]

Паезчы ліст гарадзенскага земскага падсудка Тамаша Валовіча на выкананне дэкрэту Галоўнага Трыбунала ВКЛ ад 18 снежня 1666 г. па справе паміж Эвай Заранковай, удавой Міхала Шылпіна, і Крыштафам Бухавецкім, маршалкам гарадзенскім, старостам мерацкім і філіпоўскім.

*Дата:* 17 мая 1667 г.

*Мова:* польская.

*Аб'ём:* 2 арк.

*Шыфр:* Ф. 1759, воп. 1, спр 1, арк. 5–6.

№ 11.

***Валовіч Крыштаф Казімір,*** слонімскі земскі пісар, 1676 г.

Інструкцыя сойміка шляхты Слонімскага павета для паслоў Лявона Палубінскага, наваградскага ваяводзіча і Стэфана Слізня на Варшаўскі сойм 1676 г.

*Дата:* 10 снежня 1676 г.

*Мова:* польская.

*Пячатка:* дакумент замацаваны пячаткай з асабістым складаным гербам слонімскага маршалка Гераніма Пясецкага, 15×16 мм.

*Аб'ём:* 10 арк.

*Шыфр:* Ф. 1663, воп. 1, спр. 412, арк. 70–79.

[5] Тамаш Станіслаў Валовіч, гарадзенскі земскі падсудак у 1663–1670 гг.: UWKL WT. S. 303.

№ 12.

***Валовіч Міхаіл,*** падкаморы слонімскі, 1685 г.

Заменны ліст слонімскага падкаморыя Міхаіла Валовіча і яго жон-княжны Соф'і Масальскай на 2 нівы ў маёнтку Радзівілавічы для Казіміра і Настазыі з Корчыцаў Грыгаровічаў.

*Дата:* 25 мая 1685 г.

*Мова:* польская.

*Аб'ём:* 2 арк.

*Шыфр:* Ф. 1663, воп. 1, спр. 565.

№ 13.

***Валовіч Аляксандр Уладзіслаў,*** гарадзенскі земскі падсудак, 1687 г.[6]

Вызнаны ліст гарадзенскага земскага падсудка Аляксандра Валові для ксяндза Антаніна Угнеўскага, гарадзенскага прэора Ордэна Св. Даміні- аб перадачы яму ўсіх дваровых будынкаў, пабудаваных на пляцы на вул. Калючынскай у Горадні.

*Дата:* 23 лістапада 1687 г.

*Мова:* польская.

*Аб'ём:* 1 арк.

*Шыфр:* Ф. 1759, воп. 1, спр. 1, арк. 13.

№ 14.

***Валовіч Крыштаф Казімір,*** слонімскі земскі пісар і паборца, 1690 г.

Пабаровы квіт слонімскага земскага пісара і паборцы Крынітафа Казіміра Валовіча аб выплаце браслаўскім скарбнікам Міхалам Юрыем Жас... падымнага падатку з маёнтка Забуле ў Слонімскім павеце.

*Дата:* 20 жніўня 1690 г.

*Мова:* польская.

*Пячатка:* дакумент замацаваны пячаткай Крынітафа Казіміра Валовіча, 18×20 мм.

*Аб'ём:* 2 арк.

*Шыфр:* Ф. 1663, воп. 1, спр. 722.

[6] Аляксандр Уладзіслаў Валовіч, гарадзенскі земскі падсудак у 1682–1688 гг.: UWT. WT. S. 303.

№ 15.

***Валовіч Уладзіслаў Аляксандр,*** крайчы Жамойцкага княства, 1696 г.

Заменны ліст на грунты паміж Уладзіславам Аляксандрам Валовічам, крайчым Жамойцкага княства і Мікалаем Мізгірам, чанінікам ваўкавыскім, у іх маёнтку Хмельніца і фальварку Крывец адпаведна.

*Дата:* 20 лютага 1696 г.

*Мова:* польская.

*Пячатка:* дакумент замацаваны пячаткай з гербам «Багорыя» Уладзіслава Аляксандра Валовіча, 12×14 мм.

*Аб'ём:* 2 арк.

*Шыфр:* Ф. 1663, воп. 1, спр. 1039.

№ 16.

***Валовіч Уладзіслаў Аляксандр,*** крайчы Жамойцкага княства, 1697 г.

Выпіс з каптуровых кніг Слонімскага павета з копіяй прадажнага ліста ад 11 верасня 1692 г. жамойцкага крайчага Уладзіслава Аляксандра Валовіча і яго жонкі Барбары Орвід для браслаўскага падчаніага Юрыя Гедройця на селяніна з вёскі Хмельнiца Панаса Харытончыка.

*Дата:* 28 жніўня 1697 г.

*Мова:* старабеларуская, польская.

*Пячатка:* дакумент замацаваны пячаткай з асабістым складаным гербам слонімскага земскага і каптуровага пісара Крыштафа Казіміра Валовіча, 27×30 мм.

*Аб'ём:* 2 арк.

*Шыфр:* Ф. 1663, воп. 1, спр. 4672, арк. 1-2.

№ 17.

***Валовіч Антоній,*** падсудковіч слонімскі, 1714 г.

***Валовіч Ян,*** падсудковіч слонімскі, 1714 г.

Выпіс з гродскіх кніг Слонімскага павета па справе слонімскіх падсудковічаў Антонія і Яна Валовічаў са слонімскім войскім Міхалам Юрыем Жабкай аб наездах на межы іх маёнтку Хмельніца і фальварку Забуле адпаведна.

*Дата:* 13 снежня 1714 г.

*Мова:* польская.

*Пячатка:* дакумент замацаваны пячаткай з уласным гербам «Булгак»

слонімскага стольніка і судовага падстаросты Яна Флярыяна Булгака, 32×35 мм.

*Аб'ём:* 9 арк.

*Шыфр:* Ф. 1663, воп. 1, спр. 2187.

№ 18.

***Валовіч Антаніна з Загароўскіх,*** удава Марцыяна Дамініка Валовіча, вялікага марніалка ВКЛ, 1717 г.[7]

Улеўковы ліст ксяндза Цібуртуса, прэёра Гарадзенскага канвента Ордэна кармелітаў для Антаніны з Загароўскіх Валовіч, вялікай марніалковай ВКЛ на двор з пляцам у Горадні.

*Дата:* 21 верасня 1717 г.

*Мова:* польская.

*Аб'ём:* 2 арк.

*Шыфр:* Ф. 1663, воп. 1, спр. 566.

№ 19.

***Валовіч Антоній,*** падсудковіч слонімскі, 1737 г.

Выпіс з гродскіх кніг Слонімскага павета аб уручэнні у маёнтку Хмельніца генералам Янам Ставашэўскім позвы ў суд Антонію Валовічу, падсудковічу слонімскаму, і яго жонцы Багуміле з Таўрыловічаў па справе з Антоніем Юрыем Жабкай, канюным слонімскім і Міхалам Слізнем, падкаморыем ВКЛ, старостам крэўскім.

*Дата:* 9 сакавіка 1737 г.

*Пячатка:* дакумент замацаваны пячаткай з уласным гербам «Булгак» Андрэя Міхала Булгака, 34×38 мм.

*Мова:* польская.

*Аб'ём:* 2 арк.

*Шыфр:* Ф. 1663, воп. 1, спр. 143, арк. 3–3 адв.

№ 20.

***Валовіч Антоній,*** падсудковіч слонімскі, 1738 г.

Выпіс з гродскіх кніг Слонімскага павета аб пацвярджэнні уручэння судовай позвы Антонію і Багуміле з Таўрыловічаў Валовічам у іх справе

[7] Metryka Litewska. Księga Sigillat 1709–1719. S. 20, 21, 103, 235.

з Антоніем Юрыем Жабкам, канюшым слонімскім, і Міхаілам Слізнем, падкаморыем ВКЛ, старостам крэўскім.

*Дата:* 26 чэрвеня 1738 г.

*Пячатка:* дакумент замацаваны пячаткай з уласным гербам «Булгак» Андрэя Міхала Булгака, 34×38 мм.

*Мова:* польская.

*Аб'ём:* 2 арк.

*Шыфр:* Ф. 1663, воп. 1, спр. 143, арк. 4–4 адв.

№ 21.

***Валовіч Антоній,*** падсудковіч слонімскі, 1738 г.

Рэестр дакументаў за 1678–1738 гг. па справе Антонія Валовіча, падсудковіча слонімскага, і яго жонкі Багумілы Таўрыловіч з Антоніем Жабкам, канюшым слонімскім, і Міхаілам Слізнем, падкаморыем ВКЛ, старостам крэўскім.

*Дата:* 7 ліпеня 1738 г.

*Мова:* польская.

*Аб'ём:* 2 арк.

*Шыфр:* Ф. 1663, воп. 1, спр. 143, арк. 7–7 адв.

№ 22.

***Валовіч Дамінік Марцін,*** рэферэндарый ВКЛ, староста пурвенскі, палкоўнік ЯКМ, 1741 г.[8]

Улеўковы і зрачоны ліст Магдалены Пац, старэйшай Ордэна Св. Бенедыкта віленскага кляштара Св. Катарыны для Дамініка Марціна Валовіча, рэферэндарыя ВКЛ на маёнтак Божын у Менскім ваяводстве.

*Дата:* 11 студзеня 1741 г.

*Мова:* польская.

*Аб'ём:* 3 арк.

*Шыфр:* Ф. 1664, воп. 1, спр. 763.

[8] Дамінік Марцін Валовіч, рэферэндары ВКЛ у 1727–1750 гг., гусарскі палкоўнік, пурвянскі староста, памёр халастым 27 снежня 1750 г.: Zychlinski T. Zlota księga szlachty polskiej. R. XI. S. 271.

№ 23.

***Валовіч Антоній Эразм,*** ксёндз, біскуп луцкі і берасцейскі, пасля 1755 г.[9]

Сутнасць судовай справы луцкага і берасцейскага біскупа, ксяндза Антонія Эразма Валовіча з магістратам і ўсім местам ЯКМ Берасцем.

*Дата:* другая палова XVIII ст.

*Мова:* польская.

*Аб'ём:* 1 арк.

*Шыфр:* Ф. 1663, воп. 1, спр. 4889.

№ 24.

***Валовіч Антоній Казімір,*** крайчы Жамойцкага княства, 1759 г.

***Валовіч Геранім,*** старосціч калачэўскі, 1759 г.

Выпіс з кніг Варнянскага магістрата з прадажным лістом жамойцкага крайчага Антонія Казіміра Валовіча і яго жонкі Праксэды Варанові ад 12 сакавіка 1759 г. на маёнтак Падрэзаўнічызна ў Слонімскім павеце для Гераніма Валовіча, старосціча калачэўскага.

*Дата:* 10 ліпеня 1759 г.

*Пячатка:* дакумент замацаваны магдэбургскай пячаткай Варня з гербам «Св. Юрый», Ø 45 мм[10].

*Мова:* польская.

*Аб'ём:* 2 арк.

*Шыфр:* Ф. 1663, воп. 1, спр. 4185.

№ 25.

***Валовіч Геранім,*** старосціч калачэўскі, 1760 г.

***Валовіч Лявон,*** старосціч калачэўскі, 1760 г.

Выпіс з кніг Галоўнага Трыбуналу ВКЛ з выпісам з меських кніг Жыровіцкай магдэбургіі ад 6 красавіка 1759 г. прадажнага ліста ад 5 красавіка 1759 братоў Гераніма і Лявона Валовічаў, старасцічаў калачэўскіх, на маёнта

[9] Ксёндз Эразм Антоніи Валовіч, нарадзіўся 19 верасня 1714 г.?, памёр 6 ліпеня 1770 г., серадзкі гродскі рэгент, гнезненскі канонік у 1740 г., віленскі канонік у 1742, жамойцкі архідыякан у 1743 г., пісар ВКЛ у 1744 г., варшаўскі дэкан у 1745 г., сакратар ВКЛ у 1748 г., луцкі і берасцейскі біскуп у 1755 г., кавалер Ордэна Белага Арла у 1757. Гл.: Zychlinski T. Zlota księga szlachty polskiej. R. XI. S. 278–282.

[10] Rimsa E. Pieczęcie miast Wielkiego Księstwa Litewskiego. Warszawa, 2007. S. 116

Хмельніца для менскага крайчага Юзафа Про(у)нынскага.

*Дата:* 14 сакавіка 1760 г.

*Пячатка:* дакумент замацаваны пячаткай Галоўнага Трыбунала ВКЛ мінскай кадэнцыі 1759 і 1760 г., 51×56 мм.

*Мова:* польская.

*Аб'ём:* 9 арк.

*Шыфр:* Ф. 1663, воп. 1, спр. 4670.

№ 26.

***Валовіч Казімір Юзаф,*** маршалак Слонімскага павета, 1761 г.

Выпіс з кніг Галоўнага Трыбуналу ВКЛ аб унясенні ў іх прыватнага ліста слонімскага марніалка Казіміра Юзафа Валовіча да Багуслава Шукевіча, стражніка слонімскага, аб прыналежнасці фальварка Чырвоны Стаў да маёнтка Дзевяткавічы.

*Дата:* 22 мая 1761 г.

*Мова:* польская.

*Пячатка:* дакумент замацаваны пячаткай Галоўнага Трыбуналу ВКЛ мінскай кадэнцыі 1761 г., 50×58 мм.

*Аб'ём:* 2 арк.

*Шыфр:* Ф. 1663, воп. 1, спр. 2278.

№ 27.

***Валовіч Казімір Юзаф,*** марніалак Слонімскага павета, 1764 г.

Прававыя падставы на валоданне Галенскай пушчай слонімскага маршалка Казіміра Юзафа Валовіча ў справе па яго спрэчцы аб ёй з слонімскім харужым Янам Казімірам Макавецкім.

*Дата:* 7 мая 1764 г.

*Мова:* польская.

*Аб'ём:* 7 арк.

*Шыфр:* Ф. 1663, воп. 1, спр. 567.

№ 28.

***Валовіч Казімір Юзаф,*** марніалак Слонімскага павета, 1767 г.

Рэестр дакументаў на маёнтак Хмельніца ў Слонімскім павеце, спісаны пры перадачы яго ваўкавыскаму земскаму суддзічу Ігнацыю Быхаўцу і падпісаны сярод іншых сведкаў слонімскім марніалкам Казімірам Юзафам

Валовічам.

*Дата:* 22 красавіка 1767 г.

*Мова:* польская.

*Аб'ём:* 3 арк.

*Шыфр:* Ф. 1664, воп. 1, спр. 751, арк. 1–3 адв.

№ 29.

***Валовіч Казімір Юзаф,*** маршалак Слонімскага павета, 1771 г.

Рэестр спраў кампрамісарскіх судоў паміж слонімскім маршалкам Казімірам Юзафам, яго сынам неманойцкім старостам Міхалам і – з іншага боку – слонімскім харужым Янам Казімірам Макавецкім і іншымі, па спрэчках аб маёнтках Парэчча, Лукошца, Наркаўшчызна і іншых у Слонімскім павеце.

*Дата:* 12 ліпеня 1771 г.

*Мова:* польская.

*Аб'ём:* 43 арк.

*Шыфр:* Ф. 1663, воп. 1, спр. 4518.

№ 30.

***Валовіч Антоній,*** падсудковіч слонімскі, староста калачэўскі, 1776–1777 гг.

Выпіс з гродскіх кніг Пінскага павета аб унясенні скаргі Тэафілі з Бутманаў Габрыэлевай Хрустоўскай на слонімскага падсудковіча Антонія Валовіча за захоп маёнтка Хмельніца.

*Дата:* 11 лістапада 1776 г. – 3 лютага 1777 г.

*Пячатка:* дакумент замацаваны пячаткай з гербам «Рох III» Міхала Пшаздзецкага, пінскага судовага старосты, 57×64 мм.

*Мова:* польская.

*Аб'ём:* 1 арк.

*Шыфр:* Ф. 1663, воп. 1, спр. 4668.

№ 31.

***Валовіч Геранім,*** староста азярцоўкі, 1777 г.

***Валовіч Лявон,*** староста калачэўскі, 1777 г.

Выпіс з земскіх кніг Пінскага павета аб заяўленым рэляцыйным лісце генерала Бенедыкта Квяткоўскага аб уручэнні ў Азярцах позвы ў суд

...ўнага Трыбуналу ВКЛ азярцоўскаму старосце Гераніму і калачэўскаму ...росце *Лявону Валовічам па справе Яна Быхаўца, маршалка ваўкавыскага, ...ра Ордэна Св. Станіслава,* і Ігнацыя Быхаўца, ваўкавыскага земскага ...

*Дата:* 23 студзеня 1777 г.

*Пячатка:* дакумент замацаваны пячаткай пінскага земскага суда з вы-...вай «Пагоні», 50×60 мм.

*Мова:* польская.

*Аб'ём:* 1 арк.

*Шыфр:* Ф. 1664, воп. 1, спр. 291.

№ 32.

***Валовіч Антоній,*** шамбелян ЯКМ, 1780 г.

Заява сведкаў: Юзафа Францішка Сухадольскага, ваўкавыскага судовага ...дстаросты, Казіміра Высоцкага, каморніка ваўкавыскага, Уладзіслава ...тоі Аўсянага і Вінцэнта Залескага па справе Антонія Валовіча, шамбеляна ...М, аб прадстаўленні ім у суд дакументаў княжны Ізабэлы Масальскай, ...онкі Лукаша Войны у 1652 г.

*Дата:* 27–28 студзеня 1780 г.

*Мова:* польская.

*Аб'ём:* 2 арк.

*Шыфр:* Ф. 1664, воп. 1, спр. 395.

№ 33.

***Валовіч Міхал Вінцэнт,*** скарбовы пісар ВКЛ, 1791 г.

Позва ў суд Галоўнага Трыбуналу ВКЛ Рафалу Слізню і іншым са-...зельнікам па скарзе скарбовага пісара Міхала Вінцэнта Валовіча і яго ...онкі Петранэлі Свянціцкай у справе аб спрэчных землях па рацэ Вільшы.

*Дата:* 4 лістапада 1791 г.

*Мова:* польская.

*Аб'ём:* 2 арк.

*Шыфр:* Ф. 1663, воп. 1, спр. 85.

* * *

Інфармацыя ў выяўленых дакументах прама ці ўскосна датычыць прадстаўнікоў роду Валовічаў з розных галін. Адзін дакумент адносіцца

да Анташны Загароўскай – удавы па Марцыяну Дамшіку Валовічу, вялікім маршалку ВКЛ (№ 18). Ён цікавы тым, што ў 1717 г. яна стала ўладальніцай двара і пляца ў Горадні, якім валодалі мясцовыя кармеліты. Як высвятляецца, спачатку гэты двор належаў люцінскаму старосце Самуэлю Дабрагосту Быхаўцу, потым па выраку трыбунальскага суда ён перайшоў да смаленскага войскага Габрыэля Казіміра Отамэнка, а 19 ліпеня 1712 г. апошні ўлеўковым правам перадаў яго гарадзенскім кармелітам[11]. Наколькі можна меркаваць, гэта быў двор на вуліцы Залатой, які Самуэль Дабрагост Быхавец набыў у 1691 г.[12] Апрача гэтага, дакумент фіксуе на 1717 г. Анташу ўдавой, бо яе муж памёр 5 жшуня 1712 г., у той жа час вядома, што пазней яе мужам з'яўляўся Тамаш Замойскі[13].

Яшчэ адзін дакумент, які раскрывае ўладанні Валовічаў у Горадні, быў складзены гарадзенскім земскім падсудкам Аляксандрам Уладзіславам Валовічам у 1687 г. (№ 13). Высвятляецца, што ён арандаваў у гарадзенскіх дамініканаў пляц у Горадні на вуліцы Калючынскай, паміж дварамі гарадзенскага стольніка Дадзібога Граткоўскага і менскага ваяводы Міхала Сясіцкага, каб пабудаваць сабе двор «dla przyjazdu swego bez płacenia czynszu»[14]. Ён належаў Аляксандру Казіміру Валовічу «да жывата», а пасля яго смерці пляц з будынкамі павінен быў адысці да гарадзенскіх дамініканаў[15].

Выяўленыя дакументы дазваляюць удакладніць інфармацыю пра прадстаўнікоў ужо вядомых графскай (№ 32) і слонімскай галін Валовічаў (№ 26–29, 33). Але большасць з іх (№ 9, 11, 14–17, 19–21, 24–25, 30) датычыць нашчадкаў Крыштафа Казіміра Самуэлевіча Валовіча, слонімскага земскага пісара ў 1663–1699 гг. (гл. № 7/3 нашай папярэдняй працы). Дакумент № 9 фіксуе яго 18 лістапада 1655 г. яшчэ без якой-небудзь пасады як падпісанта («Krzysztoph Wołłowicz») вайсковай інструкцыі слонімскай шляхты, якая была складзена падчас паспалітага рушання ў абозе ў Азярніцы «Pod Chorągwią Powiatu Słonimskiego»[16]. Яго далейшая актыўная палітычная дзейнасць відаць па падпісанні павятовай соймікавай інструкцыі для паслоў на Варшаўскі сойм 1676 г.: «Krzysztof Kazimierz Wołłowicz pisarz ziemski Słonimski».

[11] НГАБГ. Ф. 1663, воп. 1, спр. 566, арк. 1.
[12] Шаланда А. Сапраўдны гербоўнік шляхты Ваўкавыскага павета ВКЛ у другой палове XVI–XVIII стст. (Б) // Герольд Litherland. 2004. № 3–4. С. 99.
[13] Metryka Litewska. Księga Sigillat 1709–1719. S. 234, 235; Zychliński T. Zlota księga szlachty polskiej. R. XI. S. 271.
[14] НГАБГ. Ф. 1759, воп. 1, спр. 1, арк. 13.
[15] НГАБГ. Ф. 1759, воп. 1, спр. 1, арк. 13.
[16] НГАБГ. Ф. 1663, воп. 1, спр. 410, арк. 164 адв.

Як можна меркаваць, слонімскі земскі пісар уваходзіў у тагачаснае вузкае кола шляхецкай эліты Слонімскага павета, бо яго подпіс стаіць услед за слонімскім маршалкам Герасімам Пясецкім, слонімскім харужым Даміянам Есманам Сынкоўскім, ашмянскім стольнікам, сакратаром ЯКМ Аляксандрам Слізнем, слонімскім гродскім суддзёй Барталамеем Уладзіславам Бруханскім і слонімскім земскім суддзёй Крыштафам Палубінскім[17] (дакумент № 11). Крыштаф Казімір Валовіч карыстаўся павагай і даверам у манарха і слонімскай шляхты, бо ў 1683 і 1690 г. яму быў даручаны сбор падымнага падатку на падставе соймавых канстытуцый[18]. Яго набаровы квіт (дакумент № 14) зафіксаваў выплату ў 1690 г. браслаўскім скарбнікам Міхалам Юрыем Жабкай з 8 дымоў маёнтка Забуле не толькі падымнага падатку, але і камісарскіх ляўдум (ухвалаў) слонімскаму падстолію і падкаморыю[19], ляўдум слонімскім ксяндзам канонікам рэгулярным і падатку на Эйсімонтаўскі касцёл[20].

Вельмі інфарматыўным для рэканструкцыі архіва слонімскіх Валовічаў з'яўляецца дакумент № 28 — «Рэестр дакументаў на маёнтак Хмельніца ў Слонімскім павеце 1767 г.». Ён уяўляе сабой спіс з загалоўкаў спраў, якія датычылі Хмельніцы — родавага гнязда Валовічаў на Слонімшчыне з першай паловы XVI ст. — і іншых іх уладанняў, падзелены на 5 фасцыкулаў. Першы ахопліваў дакументы з першай паловы XVI ст. па 1644 г. Другі — з 1759 па 1761 гг. Трэці — з 1544 па 1767 гг. Чацверты складаўся толькі з аднаго дакумента — «Інвентара маёнтка Хмельніца за 1704 г.». Пяты меў паперы за 1615—1731 гг. Як можна меркаваць, ніякай сістэмы адбору дакументаў па фасцыкулах не існавала, за выключэннем спецыфічнага «інвентарнага» 4-га і 5-га, дзе былі сабраны пераважна матэрыялы па маёнтку Радзівілавічы. Фактычна гэта былі выпадковыя скруткі родавых папераў Валовічаў, якія былі спісаны ў тым жа парадку, што і перавязаны. «Рэестр 1767 г.» быў складзены 22 красавіка 1767 г. ваўкавыскім падкаморыем Янам Быхаўцам і перададзены ім брату Ігнацыю, пра што ёсць адпаведны запіс апошняга[21].

Умоўна хмельніцкі архіў Валовічаў можна падзяліць на тры групы дакументаў: «фалькавічоўскі», «міхайлавічоўскі» і ўласна «валавічоўскі».

[17] НГАБГ. Ф. 1663, воп. 1 спр 412, арк. 78 адв.
[18] НГАБГ. Ф. 1663, воп. 1 спр 722, арк. 2, 5.
[19] Слонімскім падстоліем у 1690 г. быў гродскі падстароста Канстанты Уладзіслаў Булгак, а падкаморыем — пасля смерці Міхала Яўстахія Валовіча ў 1689 г. — Даміян Палубінскі (згадваецца на пасадзе ў 1703 г.), гл.: НГАБГ. Ф. 1663, воп. 1, спр. 599, арк. 9—9 адв.; RPWKL WN 1690. S. 114; Залівака А. Гісторыя дзяржустаноў ВКЛ. С. 41.
[20] НГАБГ. Ф. 1663, воп. 1, спр. 722, арк. 2.
[21] НГАБГ. Ф. 1664, воп. 1, спр. 751, арк. 3.

Да самых старажытных адносіліся матэрыялы, якія датычылі першага уладальніка Хмельніцы Андрэя Фальковіча ці Хвальковіча герба «Лебедзь», гаспадарскага дваранііа у 1522 г., бельскага войскага у 1531—1554 гг., бельскага падстаросты у 1533 г. і драгічынскага старосты у 1542—1556 гг.[22]:

- Ліст Яна Мікалаевіча Радзівіла, троцкага пана і слонімскага старосты да слонімскага намесніка з загадам выдзялення трох зямельных грунтоў Андрэю Фальковічу паводле гаспадарскага надання, 5 сакавіка, індыкт 1[23], 1522 г.
- Апрабацыя польскага караля і вялікага князя літоўскага Жыгімонта Старога на тры пустаўнічызны у Хмельніцы Андрэю Фальковічу, 7 кастрычніка 1523 г.
- Ліст Андрэя Фальковіча на заставу Хмельніцы Грыньку Міхайлавічу Крывому, войскаму і намесніку слонімскаму, 3 красавіка, індыкта 6.
- Ліст Андрэя Фальковіча на заставу Хмельніцы Грыньку Міхайлавічу Крывому, войскаму і намесніку слонімскаму, 25 снежня, індыкт 6.
- Ліст Андрэя Фальковіча, у якім ён абавязаўся збыць маёнтак Хмельніцы Данілу Мялешку, выкупіўшы яго у Грынькі Міхайлавіча Крывога, 20 снежня, індыкт 10.
- Упамінальны ліст польскага караля і вялікага князя літоўскага Жыгімонта Старога, пісаны да Андрэя Фальковіча, каб ён паводле учыненай дамовы прадаў навечна Хмельніцу Грыньку Міхайлавічу Крывому або аддаў пазычаныя гроны, індыкт 7, 1538 г.
- Прадажны вячысты ліст Андрэя Фальковіча на Хмельніцу для Грыгорыя Міхайлавіча Крывога, 19 чэрвеня 1540 г.

Усе згаданыя дакументы у 1540 г. апынуліся разам з маёнткам у руках наступнага уладальніка Хмельніцы — слонімскага войскага і намесніка Грыгорыя Міхайлавіча Крывога, чыя дачка выйшла замуж за Грыгорыя Грынькавіча Валовіча. Да іх папераў можна аднесці:

- Квіт Данілы Мялешкі Грыньку Міхайлавічу Крывому, у якім ён паведамляе аб атрыманні ад Андрэя Фальковіча 40 коп літоўскіх гроніаў, узятых апонінім пад заклад Хмельніцы, 10 мая, індыкт 10.
- Дэкрэт суду польскага караля і вяліка князя літоўскага Жыгімонта Старога па справе паміж Іллінічамі і Грынькам Міхайлавічам Крывым, цесцем Грыгорыя Грынькавіча Валовіча з прысуджэннем яму зямлі

[22] UPodlascy. S. 61, 91; Цітоў А. Пячаткі старажытнай Беларусі. С. 59.

[23] Тут і далей нумар індыкту падаем так, як у крыніцы. Улічваючы той факт, што Ян Мікалаевіч Радзівіл быў троцкім кашталянам толькі у 1522 г., дакумент павінен датавацца гэтым годам: UWKL WT. S. 124.

Якубаўнічызны, 25 жніўня 1541 г.[24]

- Угодлівы ліст Марыны Грыгоравай, жонкі Грынькі Міхайлавіча Крывога, войскай слонімскай, якім яна свайму зяцю Грыгорыю Грынькавічу Валовічу і яго жонцы, а сваёй дачцэ Антаніне[25], саступіла 500 коп літоўскіх грошаў, падаравала 243 капы на заставе Івацэвічаў, а таксама падаравала навечна зямлю Якубаўнічызну, куплю свайго мужа, 25 верасня 1544 г.

З 1544 г. пачынаюцца дакументы па Хмельніцы, як маёнтка Валовічаў.

Першым яго ўладальнікам быў Грыгорый Грынькавіч Валовіч, які дзякуючы шлюбу з дачкой слонімскага войскага Грынькі Міхайлавіча Крывога заклаў асновы зямельных уладанняў роду ў Слонімскім павеце. Да іх адносіліся:

- Прадажны ліст Якуба Катрыніча Грыгорыю Грынькавічу Валовічу на агарод каля Пугачоўшчызны, 5 снежня, індыкт 3, 1544 г.?
- Прывілей на пергаміне (sic!) польскага караля і вялікага князя літоўскага Жыгімонта Старога з пацверджаннем Грыгорыю Грынькавічу Валовічу дзедзічных правоў на Хмельніцу, набытую ім навечна ў Андрэя Фальковіча, старосты драгічынскага, 24 кастрычніка 1544 г.
- Угодлівы ліст слонімскага намесніка Гермагена Гарнастая[26] паміж Грыгорыем Грынькавічам Валовічам і каралеўскімі людзьмі Анімeнтовічамі па справе аб грунце Андрэеўскі маёнтка Хмельніца, 25 верасня 1546 г.
- Замена грунтамі слонімскага намесніка Богуша Міткевіча з Грыгорыем Грынькавічам Валовічам, 3 мая 1555 г.
- Замена грунтамі паміж Грыгорыем Грынькавічам Валовічам, уладальнікам Хмельніцы, і падданымі Рахоўскімі з дазволу слонімскага плябана, 10 студзеня 1561 г.

Наступныя дакументы адносіліся ўжо да нашчадкаў Грыгорыя Грынькавіча Валовіча, якія валодалі Хмельніцай да другой паловы XVIII ст.:

- Прадажны ліст слонімскага войскага Аўрама Данілавіча Мялешкі слонімскаму старосце Міхаілу Грыгоравічу Валовічу на грунт з агародам Катрынаўшчызна, 17 сакавіка 1577 г. (захаваўся ў актыкаванай копіі 1738 г., гл. дакумент № 3).

[24] Вырак па справе гл.: Метрыка ВКЛ. Кн. 28 (1522–1552 гг.). № 25. С. 75–76.

[25] Імя памылковае. Насамрэч яе звалі Алена. Гл. працу С. Рыбчонка ў кнізе.

[26] Гермаген Іванавіч Гарнастай, пісар ВКЛ у 1551–1553 гг. Гл.: Насевіч В. Гарнастаі // ВКЛЭ. Т. 1. С. 513; Яковенко Н. Українська шляхта з кінця XIV до середини XVII століття. Волинь і Центральна Україна. Київ, 2008. С. 170; Сліж Н. Сям'я Івана Гарнастая, падскарбія ВКЛ // BZH. 2012. Nr 38. S. 23.

- Зрачоны ліст мсціслаўскага ваяводы Паўла Паца, берасцейскага кашталяна Крыштафа Зяновіча і яго жонкі Тэадоры (Фядоры) Грыгораўны Валовіч, у якім яны адмаўляюцца ад сваіх прэтэнзій на Хмельніцу на карысць Валовічаў, як яе праўдзівых дзедзічаў, 30 кастрычніка 1586 г.
- Генеральская інтрамісія на Радзівілавічы Арловічы, запісаныя Багданай Мянкоўскай свайму мужу Паўлу Мянкоўскаму, 1597 г.
- Выпіс вячыстага права Гальнкі Янаўны Глябовіч, старосціны слонімскай, па першым мужы Міхаілу Грыгоравічу Валовічу, па другім – Станіславу Мікалаевічу Нарбуту, мсціслаўскай ваяводзіны, на маёнткі Сулятычы ў Наваградскім ваяводстве, Хмельніца і Белы ў Слонімскім павеце, а таксама на 1 тыс. коп літоўскіх грошаў на Мяжэвічах і 1 тыс. коп літоўскіх грошаў на Молчадзі для свайго сына Самуэля Міхайлавіча Валовіча, 1603 г.
- Выпіс з земскіх кніг Слонімскага павета прадажнага ліста Якуба Катовіча Пятру Расткоўскаму на палоску ўгноенага поля ва ўрочышчы Радзівілавічы, 12 студзеня 1615 г.
- Выпіс з копіяй з земскіх кніг Слонімскага павета аб тым, што Аляксандр Падрэз запісаў сваёй жонцы Марушы Гарадзельскай 300 коп літоўскіх грошаў, 10 кастрычніка 1616 г.
- Выпіс з копіяй з земскіх кніг Слонімскага павета аб тым, што жонка Аляксандра Падрэза, маючы ад мужа запісаныя ён на маёнтку Радзівілавічы 300 коп, адпісала іх свайму бацьку Шыману Гарадзельскаму, ваўкавыскаму земскаму пісару, 10 кастрычніка 1616 г.
- Выпіс з земскіх кніг Слонімскага павета прадажнага ліста Станіслава, Паўла і Грыгорыя Мікалаевічаў Катовічаў Пятру Расткоўскаму на палоску ўгноенай зямлі ва ўрочышчы Заполле у Радзівілавічах, 11 кастрычніка 1616 г.
- Інтрамісія (увядзенне ў валоданне) Гальшкі Сапегі, удавы па Самуэлю Міхайлавічу Валовічу, кашталяну наваградскаму, у маёнткі Хмельніца, Радзівілавічы, Парэчча і Молчадскую дзяржаву, 1626 г.
- Квіт Юзафа Валовіча, віленскага земскага суддзіча аб тым, што ён атрымаў ад Антонія Валовіча дзельчы ліст («dział Wołłowiczowski» з абавязацельствам яго вяртання, 20 красавіка 1644 г.[27]

[27] Маюцца на увазе сыны Казіміра Аляксандра Валовіча, віленскага земскага суддзі у 1692–1709 гг. – Юзаф Ігнацы († 1722 г.) і яго брат Антоні, які «памёр малады

- Тастамент пані Глядавіцкай Уніхоўскай, 2 чэрвеня 1659 г.
- Зрачоны ліст Казіміра Валовіча брату Уладзіславу Валовічу на частку маёнтка Хмельніца, 12 ліпеня 1688 г.
- Квіт Людвіка Блажаеўскага Уладзіславу Валовічу і яго жонцы са скаргай на іх аб збіцці, 15 кастрычніка 1693 г.
- Інвентар маёнтка Хмельніца ад Барбары Орвідаўны Валавічовай, слонімскай падсудковай, пры арэндным праве для берасцейскага падстолія Стэфана Куранецкага, 24 чэрвеня 1704 г.
- Выпіс права Яна Валовіча, дадзены Антонію Валовічу, старосце калачэўскаму, 13 мая 1730 г.[28]
- Прадажны вячысты ліст Крыштафа Казіміра Валовіча на Грудок, 15 лютага 1731 г.[29]
- Выпіс прыватнага ліста Казіміра Валовіча, маршалка слонімскага, 16 лютага 1759 г.
- Інтэцыза (пагадненне) паміж Геранімам Валовічам і Юзафам Про(у)шынскім, крайчым Менскага ваяводства на продаж грунтаў у Радзівілавічах, 20 лютага 1759 г.[30]

Два дакументы, як і сам «Рэестр 1767 г.», складалі ўжо набытак архіва ...хаўцаў, якія сталі наступнымі ўладальнікамі Хмельніцы і іншых зямель ...ловічаў у Слонімскім павеце:

- Прадажны вячысты ліст Юзафа Про(у)шынскага ваўкавыскаму земскаму суддзічу Яну Быхаўпу на маёнтак Хмельніца і грунт Падрэзаўнічызна за 80 тыс. злотых польскіх, 22 студзеня 1761 г.
- Інструмент (распараджэнне) ксяндза мітрапаліта (уніяцкага) аб далучэнні парафіі хмельніцкіх падданых да царквы у Дзевяткавічах і адлучэнні іх ад Слонімскай парафіі, 19 студзеня 1767 г.

На падставе «Рэестра 1767 г.», дакументаў № 9, 11, 14–17, 19–21, 24–...5, 30, а таксама вядомых з літаратуры звестак можна ўдакладніць радавод ...ії слонімскага земскага пісара Крыштафа Казіміра Самуэлевіча Валовіча ...XVII–XVIII стст.

... Zychliński T. Złota księga szlachty polskiej. R. XI. S. 270; UWKL WW. S. 173. Дата альбо ...мылковая, альбо дакумент з'яўляецца фальсіфікатам.

28 Маецца на ўвазе прадажны ліст ад 30 мая 1730 г. Яна Валовіча брату Антонію ...з другую частку Хмельніцы. Гл. ніжэй.

29 Дата або памылковая, або дакумент з'яўляецца фальсіфікатам, бо Крыштаф Казімір ...ловіч, слонімскі земскі пісар памёр каля 1702 г. Гл. ніжэй.

30 Пра Юзафа Про(у)шынскага, менскага крайчага ў 1737–1759 гг.: Чарняўскі Ф. ...днікі (пасады, тытулы) Менскага ваяводства XVI–XVIII стст. Біяграфічны даведнік. ...п. III. Мінск, 2010. С. 144–145.

## Галіна Грыгорыя Грынькавіча Валовіча: «сенатарская ці парэчанская»

### Лінія Крыштафа Казіміра Валовіча

### III КАЛЕНА[31]

***7/3. Крыштаф Казімір,*** кашталяніч навагрудскі, згадваецца у 164… пры падзеле з братамі бацькоўскай спадчыны, слонімскі земскі пісар у 166…–1699 гг., у 1654 і 1664 і г. быў дэпутатам і суддзёй Галоўнага Трыбуна… ВКЛ ад Слонімскага павета[32], паборца падымнага падатку ў 1683 і 169… у 1697 г. пісар слонімскага каптуровага суда, памёр каля 1702 г. У 1690 г. меў у Слонімскім павеце 1 дым у Радзівілавічах Падрэзаўшчы… двор у Слоніме і 1 дым у Малойчы ў Берасцейскім ваяводстве[34]. «Ро… дзед» Антонія (16/8) і Яна (17/8) Валовічаў[35].

Жонкі:

1. Ядзвіга Вярбоўская.
2. Цэцылія Бухавецкая, падсудковая берасцейская[36].

### IV КАЛЕНА

***8/7. Уладзіслаў Аляксандр,*** пісаровіч слонімскі, згадваецца без пас… у 1688 г.[37], крайчы жамойцкі ў 1689–1698 гг., у 1690, 1694 і 1698 г. б… дэпутатам і суддзёй Галоўнага Трыбунала ВКЛ ад Слонімскага паве… паводле падымнага рэестру за 1690 г. меў 10 дымоў у Хмельніцы і ка… а таксама адзін застаўны дым Леваслаўскі ў Дэркінях ў Жамойцкім княс… слонімскі земскі падсудак у 1699–1701 гг., памёр у 1701 г.[39]

Жонка: Барбара Ганна Пятроўна Орвід у 1693 г.[40] x 1 voto Э…

[31] Нумарацыя пакаленнага раскладу гэтай лініі дапасавана да генеалогіі слон… Валовічаў з нашага папярэдняга тэксту. Гл. вышэй.

[32] DTG WKL (1582–1696). S. 279, 292.

[33] RPWKL WN 1690. S. 136., przyp. 127; Залівака А. Гісторыя дзяржустаноў … С. 30; НГАБГ. Ф. 1663, воп. 1, спр. 4672, арк. 2.

[34] RPWKL WN 1690. S. 136.

[35] НГАБГ. Ф. 1663, воп. 1 спр 2187, арк. 4 адв.–5.

[36] Zychliński T. Złota księga szlachty polskiej. R. XI. S. 273.

[37] НГАБГ. Ф. 1664, воп. 1, спр. 751, арк. 2 адв.

[38] DTG WKL (1582–1696). S. 378, 392; DTG WKL (1697–1794). S. 30.

[39] НГАБГ. Ф. 1663, воп. 1, спр. 599, арк. 9; RPWKL WN 1690. S. 138, przyp. 14…

[40] НГАБГ. Ф. 1664, воп. 1, спр. 751, арк. 2 адв.

Нестрашэвіч (Страшэвіч?)[41], згадваецца памерлай у 1714 г.[42]

***9/7. Ян,*** не пакінуў нашчадкаў[43].

***10/7. Самуэль,*** не пакінуў нашчадкаў[44].

***11/7. Ізабэля (Кацярына),*** манахіня менскага манастыра Ордэна Св. Базыля[45].

***12/7. Гальшка.*** Інфармацыі бракуе.

***13/7. Казімір Крыштафавіч[46],*** пісаровіч слонімскі, у 1676 г. разам з бацькам падпісаў соймікавую інструкцыю: «K(a)z(i)m(ie)rz Wołłowicz»[47], Відавочна, гэта ён быў у 1688 г. слонімскім харужым[48], крайчы жамойцкі[49] з 1699 г.?, памёр каля 1704 г.[50]. Памылкова сцвярджалася, што не пакінуў нашчадкаў[51], насамрэч меў сына (18/13).

Жонка: Соф'я Пятроўна Орвід[52].

УВАГА! Казімір Крыштафавіч Валовіч зблытаны з Казімірам Аляксандрам Вызгінам Валовічам, паручнікам войска ВКЛ, верагодным упіцкім мечнікам у 1674–1675 гг.[53], упіцкім стольнікам у 1676–1705 гг.[54], які у 1690 г. меў 5 дымоў у Слонімскім павеце ў маёнтках Белы Дольны і Каменшчызна і 4 дымы ў застаўным маёнтку Булгакаўшчызна ці Дарогліш[55], памёр у 1719 г.[56]

[41] Żychlinski T. Zlota księga szlachty polskiej. R. XI. S. 273.
[42] НГАБГ. Ф. 1663, воп. 1, спр. 2187, арк. 6.
[43] Zychlinski T. Zlota księga szlachty polskiej. R. XI. S. 273.
[44] Ibidem.
[45] Ibidem.
[46] Так назваў яго сын Антоній Казімір Валовіч, жамойцкі крайчы у 1759 г. Гл.: НГАБГ. Ф. 1663, воп. 1, спр. 4185, арк. 1.
[47] НГАБГ. Ф. 1663, воп. 1 спр 412, арк. 78 адв.
[48] Залівака А. Гісторыя дзяржустаноў ВКЛ. С. 41.
[49] Zychlinski T. Złota księga szlachty polskiej. R. XI. S. 273.
[50] RPWKL WN 1690. S. 139, przyp. 147; Анищенко Е. Шляхта Слонимского повета. Список XVIII ст. Минск, 2012. С. 36.
[51] Zychlinski T. Zlota księga szlachty polskiej. R. XI. S. 273.
[52] Ibidem. У Яугена Анішчанкі памылкова — Соф'я Асвяда: Анищенко Е. Шляхта Слонимского повета. С. 36.
[53] UWKL WT. S. 477.
[54] Ibid. S. 529.
[55] RPWKL WN 1690. S. 139.
[56] Zychlinski T. Zlota księga szlachty polskiej. R. XI. S. 270; UWKL WT. S. 529.

## V КАЛЕНА

***14/8. Флярэнтына*** х Стэфан Куранецкі, падкаморы пінскі[57]. Стэфан Куранецкі быў берасцейскім падстоліем, якому ценіча (?) у 1704 г. здала ў арэнду маёнтак Хмельніца ў Слонімскім павеце[58].

***15/8. Ружа*** х у 1721 г. Якуб Кабылінскі, чашнік смаленскі ў 1721–1749 гг.[59]

***16/8. Антоній,*** нарадзіўся 9 студзеня 1691 г.[60], падсудковіч слонімскі у 1714 г., староста калачэўскі у 1730–1776 гг.[61] Удзельнік сойма 1733 г.[62], прыхільнік і электар Станіслава Лянічынскага[63]. 7 снежня 1750 г. ён разам з сынамі заставіў жыровіцкім айцам базыліянам свой родавы маёнтак Хмельніца ў Слонімскім павеце[64].

Жонка: Багуміла Таўрыловіч у 1737 г.[65] Памерла да 7 снежня 1750 г.[66]

***17/8. Ян,*** нарадзіўся 21 ліпеня 1688 г.?[67], падсудковіч слонімскі у 1714 г., 25 лютага 1728 г. прадаў адну частку Хмельніцы свайму роднаму брату Антонію, а 30 мая 1730 г. – другую[68]. Памёр пасля 1730 г.

Жонка: Тэафіля Бутман х 2 voto Габрыэль Хрустоўскі, жыла яшчэ у 1777 г.[69]

[57] Ibid. S. 73.

[58] НГАБГ. Ф. 1664, воп. 1, спр. 751, арк. 3 адв.

[59] Żychliński T. Złota księga szlachty polskiej. R. XI. S. 273; RPWKL WN 1690. S. 127 przyp. 80; UWKL ZSWS. S. 70.

[60] Żychliński T. Złota księga szlachty polskiej. R. XI. S. 273.

[61] НГАБГ. Ф. 1664, воп. 1, спр. 751, арк. 2 адв.; НГАБГ. Ф. 1663, воп. 1, спр. 4668 арк. 1; DTG WKL (1697–1794). S. 178.

[62] Анищенко Е. Шляхта Слонимского повета. С. 36.

[63] Elektorowie. S. 258. Запісаны памылкова як гарадзенскі крайчы. Магчыма, меў на увазе жамойцкі крайчы Антоній Казімір Валовіч (18/13).

[64] АВАК. Т. XII. С. 21–22.

[65] Żychliński T. Złota księga szlachty polskiej. R. XI. S. 273; НГАБГ. Ф. 1663, воп. 1 спр. 143, арк. 3.; У Яўгена Анішчанкі памылкова – Багуміла Гаўрыловіч: Анищенко Е. Шляхта Слонимского повета. С. 36.

[66] АВАК. Т. XII. С. 22.

[67] Żychliński T. Złota księga szlachty polskiej. R. XI. S. 273. Дата нараджэння памылковая, бо Ян называецца малодшым братам Антонія: НГАБГ. Ф. 1663, воп. 1 спр 2187, арк. 5.

[68] НГАБГ. Ф. 1664, воп. 1, спр. 751, арк. 2 адв.

[69] Żychliński T. Złota księga szlachty polskiej. R. XI. S. 273; НГАБГ. Ф. 1663, воп. спр. 4668, арк. 1; Анищенко Е. Шляхта Слонимского повета. С. 36.

***18/13. Антоній Казімір,*** крайчы жамойцкі у 1759 г. Прадаў 12 сакавіка таго ж года калачэўскаму старосцічу Герашму Валовічу за 2 тыс. тымфаў Падрэзаўшызну ў Слонімскім павеце (дакумент № 24).
Жонка: Праксэда Варановіч[70].

## VI КАЛЕНА

***19/16. Лявон Вінцэнт***[71], старосціч калачэўскі у 1759–1776 гг., староста калачэўскі у 1777 г.[72], не пакінуў нашчадкаў[73].

***20/16. Геранім Ян***[74], удзельнік сойма 1754 г.[75], старосціч калачэўскі ў 1759–1776 гг., староста азярцоўскі ў 1777 г.[76] Прадаў з братам Лявонам у 1759 г. маёнтак Хмельніца: двор Хмельніца з вёскамі Хмельніца Правая, Хмельніца Крывая і Зарэчча за 76 тыс. злотых польскіх Юзафу Про(у)шынскаму, крайчаму Менскага ваяводства. У Жамойцкім княстве ў Паюрскім павеце валодаў з братам маёнткам Шытэлі[77].
Жонка: Анэля Краеўская[78].

***21/17. Антоній,*** ксёндз, пробашч у Дворцы[79].

***22/17. Элеанора*** x 1 voto Феліцыян Грынявіцкі, пінскі рэгент, памёр у 1759 г. x 2 voto Антоній Скіндар, староста цэльскі. Памерла 8 сакавіка 1786 г.[80]

## VII КАЛЕНА

***23/20. Антаніна*** x N Квяткоўскі, крэмянецкі земскі суддзя.

***24/20. Міхал,*** памёр нежанаты.

70 НГАБГ. Ф. 1663, воп. 1, спр. 4185, арк. 1–2.
71 АВАК. Т. XII. С. 22. Названы проста Вінцэнтам.
72 НГАБГ. Ф. 1664, воп. 1, спр. 291, арк. 1.
73 Zychlinski T. Zlota księga szlachty polskiej. R. XI. Poznan, 1889. S. 273.
74 АВАК. Т. XII. С. 22. Названы Янам Геранімам і проста Геранімам.
75 Анищенко Е. Шляхта Слонимского повета. С. 36.
76 НГАБГ. Ф. 1664, воп. 1, спр. 751, арк. 12; НГАБГ. Ф. 1664, воп. 1, спр. 291, арк. 1.
77 НГАБГ. Ф. 1663, воп. 1, спр. 4670, арк. 2 адв.–7 адв.
78 Zychlinski T. Zlota księga szlachty polskiej. R. XI. S. 273.
79 Ibidem.
80 Ibidem; НГАБГ. Ф. 1664, воп. 1, спр. 751, арк. 11.

***25/20. Лукаш*** х N Юзафаўна Валовіч, не пакінулі нашчадкаў[81]. Жонк Лукаша была дачкой гарадзенскага маршалка Юзафа Юр'евіча Валовіча імя якой не было вядома ананіму, а таксама сястрой Казіміры, жонкі Тамаша (28/20)[82].

***26/20. Адам,*** па ім нашчадкі ў XIX ст.[83]

***27/20. Ян,*** нарадзіўся 31 кастрычніка 1778 г., барысаўскі межавы суддзя Пакінуў нашчадкаў[84].

Жонка: Петранэля Рыдзеўская.

***28/20. Тамаш,*** памёр 31 жніўня 1839 г. Пакішуў нашчадкаў з другоі жонкай[85].

Жонкі:

1. Казіміра Юзафаўна Валовіч, пасля разводу з Юзафам Калясантые Валовічам.
2. Кацярына Асяцімская.

*Гл. табл. 1.7. Лінія Крыштафа Казіміра Валовіча.*

* * *

Зразумела, што прадстаўлены радавод лініі Крыштафа Казіміра Валові далёка не поўны і патрабуе даследавання на падставе больш шырокага ко крыніц. Сярод яе прадстаўнікоў ёсць такія, пра каго, акрамя імёнаў, больш нічога невядома. Але відавочна і тое, што часам нават адзінкавы дакумен пралівае святло на крэўна-сваяцкія сувязі таго ці іншага прадстаўніка род дапамагае прасачыць непарыўнасць генеалогіі, вяртае з небыцця асобы якія не пакінулі выразнага следу ў гісторыі. Складзены і ўдакладнены нам радавод нашчадкаў Крыштафа Казіміра Валовіча можа паслужыць асново для далейшых генеалагічных даследаванняў.

З іншага боку, спроба аб'яднання разрозненых дакументаў, якія датычаць Валовічаў і знаходзяцца ў фондах НГАБГ, іх кароткая характарыстык павінны прыцягнуць увагу не толькі генеолагаў, але і даследчыкаў гістор-

[81] Zychlinski T. Zlota księga szlachty polskiej. R. XI. S. 273.
[82] Ibid. S. 285.
[83] Ibid. S. 273.
[84] Ibidem.
[85] Ibidem.

роду у XVII–XVIII стст. Па-першае, адсутнасць цэласнага архіва Валовічаў прымушае даследаваць расцярушаныя паперы ў архівах іншых шляхецкіх родаў ВКЛ. Асабліва каштоўнымі з'яўляюцца сведчанні пра дакументы, якія не захаваліся. Увогуле, праблема архіва ці архіваў Валовічаў можа быць тэмай спецыяльнага даследавання. Па-другое, інфарматыўнасць выяўленых дакументаў вельмі высокая, а часам іх звесткі носяць унікальны характар.

У нашым выпадку яны не толькі вырашаюць пэўныя генеалагічныя праблемы адной са слонімскіх ліній роду, але дазваляюць удакладніць кар'еры самога Крыштафа Казіміра Валовіча і яго нашчадкаў, вызначыць іх палітычную вагу ў Слонімскім павеце і краіне, прасачыць маёмасны стан і шляхі міграцыі ў іншыя рэгіёны ВКЛ.